**Касаткіна, Ф.** І кветкі жыцця / Ф. Касаткіна // Пастаўскі край. — 2006. — 18 лют. — С. 6.

# І КВЕТКІ ЖЫЦЦЯ

Вярнуўшыся ў 1990 годзе з тэрміновай службы, Віктар Шымковіч не застаўся ў сваіх Навасёлках-2, а ўладкаваўся на работу ў Андронах, дзе жыў яго дзядзя.

– У нас амаль не было моладзі, – расказваў ён, – А ў Андронах – шмат, ды і гаспадарка, на той час была мацнейшая. Таму і пераехаў сюды.

Тут, у Андронах, сустрэў хлопец і сваю «палавінку». Запала ў сэрца маладзенькая, прыгожая выхавальніца дзіцячага садка. Алена адказала ўзаемнасцю.

– Спачатку жылі ў маіх бацькоў, – успамінала Алена. – Потым калгас даў кватэру. А мне так хацелася мець свой дом і мноства кветак ля яго.

Мара збылася. Пяць гадоў таму Шымковічы атрымалі новы катэдж, у якім нават аддзелачныя работы былі зроблены. Іншая справа – як. Гаспадары не задаволіліся тым, што бачылі, і пакрысе афармлялі пакоі на свой густ. А густ у іх ёсць. У доме прыгожа, чыста, утульна. Зайшоўшы да Шымковічаў, ніколі не скажаш, што гэта вясковы дом, дзе на падвор'і карова, свінні, куры, трусы, якім трэба гатаваць корм. Але ўсе атрыбуты сялянскага побыту ў хлявах. У доме ж тэлевізар, камп'ютар, дываны. І мноства такіх раскошных кветак, што я не магла не запытацца, які яны догляд атрымліваюць, каб так буяць.

– Ніякіх сакрэтаў, – рассмяялася Алена. – Проста я іх вельмі люблю. І вакол дома, як марыла, шмат насадзіла. Шкада, што цяпер зіма, а то пабачылі б, якая прыгажосць.

Затое я пацешылася з кветак жыцця – дзяцей Шымковічаў. Старэйшаму, Алёшу, летам споўніцца 16. Заканчвае 9-ы клас і плануе далей вучыцца на менеджэра па турызме. Сярэдняму, Сашу, споўнілася шэсць, як Лена зразумела, што зацяжарыла зноў.

– А мне пад трыццаць. І зноў бяссонныя ночы, бясконцыя клопаты і трывогі? Боязна было, – успамінала жанчына. – Але так хацелася мець дачушку. Падтрымліваў муж (у яго мамы тры сыны і дачушка), падбівала мая бабуля, якая таксама мела трох сыноў і дачку. І я рашылася. І вось яна, наша «дачушка», – смяецца маці, паказваючы на пяцігадовага Андрэйку.

Хлопчыкі вельмі дружныя. Андрэйка ніякі ласунак не з'есць адзін, абавязкова падзеліцца з братамі. І яны на перапынку паміж урокамі бягуць да малога (школа і садок знаходзяцца ў адным будынку), каб пачаставаць яго апельсінам, цукеркай ці чым іншым.

– Чаго вы жадаеце сваім дзецям? – спыталася я ў бацькоў.

– Здароўя і міру, – адказалі яны, – Будуць вучыцца, потым старацца ў працы – і ўсё ў іх будзе.

Віктар Станіслававіч не толькі па кнігах ды кінафільмах ведае цану міру. Яму самому давялося адчуць, што такое вайна – амаль год служыў у Афганістане. Не любіць успамінаць той час, расказваць пра афганскія падзеі. Цямнеюць вочы, хмурнее твар: «Усяго пабачылі, і гінулі там нашы хлопцы... Не давядзі Бог сынам зведаць такое».

У той дзень, калі мы былі ў Андронах, уся сям'я Шымковічаў была ў зборы: дзеці вярнуліся са школы і садка, закончыла сваю змену іх мама, а тата знаходзіўся ў чарговым водпуску, які яму, як і іншым механізатарам, прадастаўляецца толькі зімой.

– У мінулым годзе атрымаў новы камбайн, – дзяліўся радасцю. – Добрая машына. Сёлета на жніве заняў першае месца ў гаспадарцы. І заробкі ў нас не благія.

Дарэчы, сёння Віктар Станіслававіч Шымковіч прадстаўляе СВК «Андроны» на раённым злёце перадавікоў.

– Летам яго ад цямна да цямна дома не бывае, – казала Алена. – Уся гаспадарка на мне трымаецца. Затое цяпер на Віцю, а мне «водпуск» – дарогу ў хлеў забыла, з усім ён упраўляецца.

– Алена, а каб вам далі вось такі добротны асабняк ды работу неблагую ў горадзе, ці паехалі б? – задаю «правакацыйнае» пытанне.

– Пра горад у нас пытаюцца многія. Шчыра скажу: ніколі і нічым ён нас не вабіў. Тут жа ўсё роднае. А якія прасторы і прыгажосць! І ўклад жыцця зусім іншы. Праўда, зіма надакучае. Але як толькі прыходзіць вясна, то і пабегла на градкі ды клумбы. Або што б я рабіла, калі б збылі сваю карову Крошку? Ды і паспрабуй на такую сямейку прадуктаў у магазіне накупіць. А так у нас амаль усё сваё.

Дарэчы, пра сям'ю. «Можа ўсё-такі з'явіцца ў вас дзяўчынка?» – спыталася, развітваючыся з Аленай і Віктарам. На што Алена весела рассмяялася і замахала рукамі. Хто ведае можа і канчатковае гэта рашэнне. Але ж кожную вясну над Андронамі так абяцальна кружаць буслы…

**Ф. Касаткіна**